**Зязюлькіна В.С.**
ДУА "Сярэдняя школа № 4 г. Віцебска"
(РБ, Віцебск)

## АКТЫЎНЫЯ ФОРМЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ НАСТАЎНІКА І ВУЧНЯ, РАЗВІЦЦЁ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЁРСТВА ЯК СРОДАК РАСКРЫЦЦЯ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ КОЖНАГА ДЗІЦЯЦІ

Даволі трапнае і канструктыўнае выказванне К.К. Платонава, які адзначыў, што "Адоранасць – генетычна абумоўлены кампанент здольнасцяў, якія развіваюцца ў адпаведнай дзейнасці або дэградуюць пры яе адсутнасці". Гэтыя словы маюць непасрэдныя адносіны да адукацыйнай сферы, гавораць аб неабходнасці стварэння такіх педагагічных умоў, якія спрыяюць не толькі максімальнаму развіццю таленту, здольнасцяў, але і асобы адоранага дзіцяці ў цэлым пры ўмове захавання яго псіхалагічнага і фізічнага здароўя, а таксама камфортнага становішча ў дзіцячым калектыве. Трэба адзначыць, што не кожны від адоранасці мае адносіны да школы. Для поспеху ў агульнаадукацыйнай школе важныя наступныя віды адоранасці: акадэмічная, інтэлектуальная, інфармацыйна-камунікатыўная, творчая, грамадска-актыўная, спартыўная. [5]

На маю думку, многія дзеці таленавітыя. Хтосьці любіць фізіку і матэматыку, другі цудоўна спявае, грае на музычных інструментах, танцуе, нехта захапляецца спортам, мовамі. Галоўнае, своечасова заўважыць захапленні вучняў, дапамагчы раскрыць свой талент, падтрымаць іх, правільна выбраць дадатковыя заняткі, распрацаваць індывідуальную праграму работы школьніка, уключыць яго у дзейнасць, якая будзе прыносіць яму не толькі поспех, пашырэнне ведаў, але і задавальненне. Трэба ўсебакова вывучаць псіхалагічны партрэт вучня, каб уздзейнічаць на тыя ці іншыя якасці яго характару, заахвочваючы да актыўнай творчасці, а пэўныя схільнасці можна выкарыстаць для дасягнення мэты.

Галоўная мэта маёй дзейнасці – стварыць умовы для навучання, выхавання і развіцця кожнага навучэнца, далучаць вучняў да культурных каштоўнасцей беларускага народа, абуджаць у дзяцей жаданне шанаваць спадчыну, захоўваць традыцыі і абрады, распаўсюджваць набытыя веды. Для дасягнення мэты абапіраюся на развіццё індывідуальных асаблівасцей вучняў, актывізацыю іх пазнавальнай дзейнасці, выкарыстанне рознабаковых інтарэсаў. Вельмі важна стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для інтэлектуальнага развіцця адоранага вучня, стымулявання яго творчай дзейнасці.

Развіццё здольнасцей вучняў нельга аддзяліць ад развіцця іх асобы. Таму вельмі важна будаваць творчае ўзаемадзеянне настаўніка і адоранага вучня на трох прынцыпах "сама–": самапазнанне, самавызначэнне, самарэалізацыя. Вельмі



Рэпазіторый ВДУ

важныя моманты ў працэсе навучання: фарміраванне матывацыі вучня, пастаноўка мэты дасягнення і паспяховасці.

Існуюць разнастайныя формы работ з адоранымі дзецьмі. У сваёй практыцы лічу больш даступнымі і эфектыўнымі:

- індывідуальны падыход на ўроках, выкарыстанне ў практыцы элементаў дыферэнцыраванага навучання, правядзенне нестандартных формаў урока;
- вядзенне спецкурсаў у сістэме факультатыўных заняткаў з улікам індывідуальных здольнасцяў адораных дзяцей;
- арганізацыя і правядзенне алімпіяд, конкурсаў, віктарын;
- арганізацыя гурткоў па інтарэсах;
- групавыя заняткі па паралелях класаў з моцнымі вучнямі;
- заняткі ў рознаўзроставай групе (вучні 9-11 класаў);
- заняткі даследчай і праектнай дзейнасцю;
- індывідуальная работа.

На ўроках стараюся вучыць дзяцей разважаць, спрачацца, не проста адстойваць свой пункт гледжання, але доказна будаваць сваё выказванне. Выкарыстоўваю праблемныя пытанні, развіваючыя гульні і гульнёвыя сітуацыі, конкурсы, віктарыны. Пры падрыхтоўцы да ўрока прадумваю кожнае заданне, звяртаюся да інтэрактыўных метадаў і прыёмаў, стараюся адаптаваць іх да канкрэтнага моўнага матэрыялу. Практыкую правядзенне некаторых этапаў урока самімі вучнямі. За некалькі ўрокаў да запланаванай дзелавой гульні паведамляю чатыром-пяці ініцыятыўным вучням, што на ўроку яны па чарзе будуць выконваць ролю настаўніка (да дзесяці хвілін). Застаюся з вучнямі пасля ўрокаў і абмяркоўваю змест і парадак заданняў. Пасля сігналу "вучань-настаўнік" выходзіць да дошкі і праводзіць апытанне або выконвае заданне. Прыемна, што вучні творча падыходзяць да сваёй ролі, рыхтуюць крыжаванкі, міні-віктарыны, актыўна выкарыстоўваюць у сваіх заданнях фразеалагізмы, прыказкі, навуковыя звесткі па тэме. Вучні, якія захапляюцца камп'ютарам з задавальненнем рыхтуюць мультымедыйныя прэзентацыі і міні-праекты па праграмных тэмах мовы і літаратуры. Мастацкая творчасць навучэнцаў праяўляецца праз падрыхтоўку кластэраў, складанне апавяданняў, вершаў, сінквейнаў. У працы з катэгорыяй адораных дзяцей ужываю дыферэнцыраваныя заданні не толькі на ўроках, але і распрацоўваю дыферэнцыраваныя хатнія заданні, выкананне творчых, нетрадыцыйных заданняў, апераджальныя заданні. Безумоўна, для таго, каб патэнцыял адоранага вучня раскрыўся цалкам, неабходна весці планамерную, сістэматычную, штодзённую індывідуальную працу на кожным уроку.

Вядома, што ўрок – гэта асноўная форма арганізацыі працэсу моўнага і літаратурнага навучання, але пазаўрочная дзейнасць адкрывае больш магчымасцей для развіцця асобы. Мае вучні з задавальненнем наведваюць факультатывы, з цікавасцю займаюцца навукова-даследчай працай, паспяхова ўдзельнічаюць у алімпіядах, а свае творчыя здольнасці раскрываюць у фальклорным гуртку "Вясёлка".

На факультатывах працую над узбагачэннем літаратурных і моўных ведаў, пашырэннем культуралагічнай эрудыцыі, развіццём індывідуальных схільнасцей і здольнасцей, аналітычных уменняў вучняў. Вучні развіваюць і паглыбляюць уменне самастойна працаваць з крытычнай літаратурай, энцыклапедычнымі і навуковымі выданнямі. На факультатыўных занятках выкарыстоўваю наступныя формы навучання: гурткі, лекцыі, практычныя заняткі, семінары, дыспуты,

Рэпазіторый ВГУ

“мазгавы штурм”, “свабодны мікрафон”, навуковыя канферэнцыі, камбінаваныя заняткі.

Кожны год мае вучні займаюць прызавыя месцы ў навукова-даследчых канферэнцыях і алімпіядах. Для эфектыўнасці даследча-пошукавай працы выкарыстоўваю наступны алгарытм:

1. Кансультацыя вучняў, азнаямленне з бібліяграфіяй.
2. Паказ узораў прац.
3. Сістэматызацыя ведаў вучняў пра даклад, рэферат.
4. Падбор тэмы, пастаноўка мэты, вызначэнне актуальнасці.
5. Азнаямленне з літаратурай па тэме.
6. Назапашванне матэрыялаў.
7. Адбор інфармацыі, рэдагаванне тэкстаў.
8. Афармленне працы. Падрыхтоўка да яе абароны.
9. Анатацыя.
10. Падрыхтоўка мультымедыйнай прэзентацыі.

У працэсе арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці вучняў ствараю ўсе ўмовы для фарміравання высокаадукаванай, інтэлектуальнай, мабільнай і актыўнай асобы. Вучні авалодваюць навыкамі самаадукацыі, яны здольны арыентавацца ў патоку інфармацыі. Удзел у школьных і гарадскіх навукова-практычных канферэнцыях дае вопыт публічнага выступлення і павышае культуру зносін школьнікаў.

Вялікая выхаваўчая мудрасць народа заключаецца ў народных традыцыях, святах, звычаях, абрадах. Вусная народная творчасць – важнейшая частка духоўнай культуры народа – надзвычай добра захавалася не толькі ў памяці беларусаў, але і ў актыўным побыце, адыграла вялікую ролю ў нацыянальнай самасвядомасці, ў развіцці літаратуры і мастацтва; яна плённа ўплывае і сёння на працэсы нацыянальнага адраджэння; дапамагае выхаванню патрыятычных і грамадзянскіх пачуццяў вучняў. На ўроках і факультатывах у некаторых навучэнцаў яскрава праяўляліся творчыя і артыстычныя здольнасці, для развіцця якіх мною была арганізавана дзейнасць фальклорнага гуртка, што на дадзены момант перарос у фальклорны калектыў “Вясёлка”. Дзеці шукаюць папараць-кветку, гукаюць вясну, частуюцца смачнымі блінамі-аладкамі на Масленіцу, удзельнічаюць у пасядзелках і гуляннях, рыхтуюць школьныя святы, паказваюць абрадавыя пастаноўкі, арганізоўваюць для вучняў пачатковых класаў “Гадзінкі беларускіх народных гульняў”, святы “Загаданачка”, “Жыві, прыпеўка”. Такая дзейнасць дазваляе не толькі развіваць здольнасці вучняў, але і фарміраваць у іх сацыяльны аптымізм, патрыятызм, грамадзянскасць, упэўненасць у тым, што галоўнае багацце любой краіны – чалавек. Падрыхтоўка да тэатралізаваных мерапрыемстваў – гэта складаная і цікавая праца па развучванню роляў сцэнара, пастаноўцы сюжэту прадстаўлення. Гуртkоўцы рыхтуюць адпаведныя дэкарацыі, касцюмы, падбіраюць музычнае суправаджэнне. Ва ўсіх пералічаных відах дзейнасці вучні маюць магчымасць раскрыць свае здольнасці, праявіць якасці акцёра, мастака, музыкі, рэжысёра, дарадцы. Хочацца адзначыць, што фальклорны калектыў “Вясёлка” не толькі карыстаецца папулярнасцю ў школе, але і мае высокія дасягненні на конкурсах і фестывалях раённага і гарадскога ўзроўню. Адзначаецца дыпломамі, граматамі, падзякамі і сам калектыў і асобныя вучні ў намінацыі “За акцёрскае майстэрства”.

Настаўнік-славеснік выкладае ў школе літаратуру – адметную дысцыпліну, якая ўздзейнічае адначасова і на эмацыянальны стан вучня, і на яго разумовыя здольнасці. У выніку індывідуальнай сістэмнай работы ў вучняў з’яўляецца жаданне не толькі больш чытаць, але і спрабаваць свае творчыя сілы ў паэзіі і



Репозиторий ВГУ

прозе. Мае вучні пішуць вершы, удзельнічаюць ў творчых конкурсах ад школьнага да рэспубліканскага ўзроўню. Дзеці вучацца назіраць, супастаўляць, думаць, адчуваць розныя эмоцыі, шукаць трапнае слова, параўноўваць розныя маўленчыя сродкі. Любоў да выканання нестандартных, крэатыўных заданняў нельга выхаваць без прысутнасці на занятках творчай атмасферы, без адчування роднага слова, яго дакладнасці і ўмення ім карыстацца.

З мэтай садзейнічання ў навуковай падрыхтоўцы творча адораных школьнікаў і атрымання метадычнай дапамогі настаўнікам ў нашай школе ідзе стварэнне інтэграванай адукацыйнай прасторы “школа – ВНУ”, якая прадугледжвае сумесную працу настаўнікаў і выкладчыкаў універсітэта па выхаванні творча актыўнай моладзі, здольнай да прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці ў галіне навукі, фарміраванню схільнасцей школьнікаў да авалодання метадамі навуковага пазнання і прафесійнымі навыкамі ў навуковай сферы. У рамках праекта “Школа – ВНУ”, адным з каардынатарам і выканаўцам якога я з’яўляюся, прадугледжана правядзенне выкладчыкамі ВДУ імя П. М. Машэрава кансультацый для настаўнікаў і вучняў па навукова-даследчай працы, факультатыўных заняткаў па падрыхтоўцы вучняў да алімпіяд, арганізацыя сумесных творчых конкурсаў, навукова-практычных канферэнцый, правядзенне студэнтамі прафарыентацыйных гутарак са школьнікамі, арганізацыя сумесных навукова - адукацыйных мерапрыемстваў для вучняў (экскурсіі, навуковыя семінары, канферэнцыі, выставы). Мэтай дадзенага праекта з’яўляецца развіццё ў моладзі цікавасці да даследчай дзейнасці і навуковай работы, садзейнічанне больш шырокаму і глыбокаму азнаямленню школьнікаў з сучаснымі навуковымі дасягненнямі, навучанне школьнікаў асновам тэхнікі прадстаўлення і прэзентацыі ўласных вынікаў і праектаў, стварэнне для маладых даследчыкаў асяроддзя навуковых зносін, садзейнічанне абмену вопытам і самарэалізацыі моладзі ў навуковай сферы.

Мае вучні ўдзельнічаюць у конкурсе “Буслік”, удзельнічаюць у раённым этапе Рэспубліканскай алімпіяды і займаюць прызавыя месцы, ёсць пераможца абласнога этапу. Алімпіяды садзейнічаюць павышэнню цікавасці падрастаючага пакалення да гуманітарных навук, выяўленню і далейшаму развіццю маладых талентаў, развіваюць творчую ініцыятыву, выхоўваюць волю, характар, пашыраюць і паглыбляюць веды вучняў. Яны аказваюць дапамогу ў прафесіянальнай арыентацыі і падрыхтоўцы да паступлення ў ВНУ.

Дзякуючы актыўным формам ўзаемадзеяння настаўніка, навучэнцаў, развіццю сацыяльнага партнёрства, дасягаюцца наступныя вынікі:

1. Забяспечваецца інтэнсіўнае інтэлектуальнае, творчае і асобаснае развіццё вучня.
2. Фарміруецца ў вучняў патрэбнасць да самапазнання, самавызначэння, самарэалізацыі і самаразвіцця.
3. Прабуджаюцца актыўныя даследчыя інтарэсы, фарміруюцца навукова-даследчыя уменні і навыкі.
4. Павышаецца агульная культура вучняў.
5. Узбагачаецца сацыяльны вопыт міжасабовых зносін.
6. Развіваецца ўпэўненасць у сваіх сілах.
7. Ствараюцца ўмовы для прафесійнага самавызначэння.

Хочацца адзначыць, што толькі цеснае ўзаемадзеянне вучэбнай, пазаўрочнай і выхаваўчай дзейнасці, толькі агульныя намаганні настаўнікаў, выкладчыкаў, вучняў могуць служыць падставай для раскрыцця і развіцця індывідуальных асаблівасцей і творчых здольнасцей дзяцей. Галоўнае для дасягнення поспеху –

Рэпазіторый ВДУ

гэта стварэнне ўмоў, якія садзейнічаюць развіццю магчымасцей і станаўленню асобы вучня.

**Спіс літаратуры**


1. Борисевич, А. Р. Коллективное творчество / А.Р. Борисевич, В. Н. Пунчик. - Мн.: «Красико-Принт», 2009.
2. Комарова, А.В. Психолого-педагогическое сопровождение одарённых школьников / А. В. Комарова. - Мн.: «Красико-Принт», 2008.
3. Лазарук, М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю / М. А. Лазарук. - Мн.: НА, 1994.
4. Лейтэс, Н.С. Узроставая адоранасць школьніка / Н.С. Лейтэс. - М. , 2000.
5. Одаренный ребенок и семья / сост. С. Н. Куровская. – Мозырь: Белый Ветер, 2006.
6. Теплов, Б. М. Здольнасці і адоранасць / Б. М. Теплов // Псіхалогія індывідуальных адрозненняў. Хрэстаматыя . – М., 2000.


Репозиторий ВГУ